Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Год IV Вільня 28 (10/VI) мая 1909 г. № 22.

Наша Ніва

Першая Беларуская Газэта з Рысункамі

Выходзіць што тыдзень рускімі і польскімі літэрамі.

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вуліца, д. № 20.**

Цэна з перасылкою і дастаукою да хаты: на 1 г.—2 р. 50 к,, на 6 мес. — 1 р. 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 мес. — 25 к. За границаю: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. —2 р., на 3 мес. —1 р. Перэмена адрэсу — 20 кап.

У ДУМЕ І КАЛЯ ДУМЫ.

114-ае заседаньне. Разбіралі праект, каб зрабіць новую Холмскую губэрню. Правіцельства хочэ па кавалку зямлі аддзяліць ад Седлецкай і Люблінскай губ., каторые дагэтуль прыналежалі да Польшчы і маюць інакшые законы і парадкі, як па ўсей Расеі. З гэтых кавалкоў маюць зрабіць асобную Холмскую губэрню, завясьці ў ей такіе парадкі, які ў „Северо-Западным“ краю (на Беларусі і ў Літве) і паменшыць правы палякоў.

* * *

115-ае заседаньне. Разбіралі дробные законы.

* * *

116-ае заседаньне. Прадседацель міністроў *Столыпін* доўга гаварыў аб тым, каб закон забараніў перэхадзіць с праваслаўнай веры ў другую. Атказываць на яго мову шмат выступіло аратароў ад акцябрыстоў, польскаго кола, народнай свабоды і соціал-дэмократоў, каторые даводзілі, што ў выбары веры трэба канецне людзям даць поўную свабоду. Свяшчэнік *Юрашкевіч* з Мінску нападаў найбольш на палякоў.

* * *

117-ае заседаньне. Абсуждаюць закон аб свабодзе рэлігіі і аб тым, каб кожны свабодне перэхадзіў у тую веру, ў якую хочэ.

Дэп. *Парчэвскі* (паляк, „польскае коло“) даводзіў, што рэлігія ад свабоды не падупадзе; напрыклад, у Англіі ёсць поўная свабода веры, але рэлігіі сваей людзі моцна трымаюцца. А тое, што

да каталіцкай веры у нас перайшло шмат праваслаўных, можна вытлумачыць тым, што ў 1839 гаду унію скасавалі і ўсіх уніатоў і нават каталікоў прымусам запісалі праваслаўнымі; тое самае было і ў Холмшчыне. Калі настала свабода, то яны ізноў вярнуліся да каталіцкай веры.

Караулов (партіі народнай свабоды) кажэ: Хрыстос прызнаваў свабоду веры, але с часам людзі пачалі за веру садзіць у вастрогі, паліць на агні. Але цяпер хрысьціянскіе народы пачалі так сама прызнаваць права кожнаму верыць так, як кажэ яму яго сумленьне. Маніфэст 17 акцябра аб'явіў такую свабоду. А цяпер міністры гавораць, што ня трэба сьпешацца з свабодай веры, бо бытцам народ праваслаўны ня хочэ гэтаго. Але гэта непраўда: некалі стараверам запечатывалі іх цэрквы, алтары, і так сама казалі, што праваслаўны народ гэтаго хочэ; цяпер жэ староверы аткрылі сваі цэрквы, бо ім гэта позволілі, і народ праваслаўны нічога не сказаў проці гэтаго. Значыць, пра народ брэхалі. А ад праваслаўя перайшло шмат у каталіцкую веру дзеля таго, што некалі, ня гледзячы на сумленьне людзкое, перэварочывалі з аднэй веры ў другую гвалтам. І дзеля таго ў Холмскай эпархіі епіскопа Евлогія пасьля маніфэста 1905 года ў адну нядзелю перэкінулося ў каталіцкую веру 15 тысяч душ.

Мілюков (ка-дэт ад Пецербурга) даводзіў, што вялікая шкода выходзіць с таго, што кожнаго праваслаўнаго лічаць ужо і рускім. Ад гэтаго і Расея ня можэ абнавіцца.

* * *

На гэтым заседаньні выйшоў вялікі скандал. Епіскоп *Евлогій* (дэпутат ад Холмчыны, правы) пачаў остра атказываць дэпутату Караулову. Таварыш прадседацеля *Мэйендорф* вельмі дэлікатне папрасіў епіскопа Евлогія гаварыць лягчэй; тады правые падняліі гвалт, пачалі стукаць па сталах кулакамі, крычучы на Мэйендорфа і лаючы яго, як ён пасьмеў зрабіць увагу архірэю?! Найболей гудзелі правые дэпутаты *Марков, Тімошкін. Вязігін* і др. Дэпутат *Замысловскій* (ад рускаго населеньня Віленск. губ.—правы) дык гудзеў больш за ўсіх, але хаваўся за другіх правых...

Акцябрысты пастанавілі: 1) сказаць дэп. Мэйендорфу, што яны стаяць на яго старане і шкадуюць, што правые яго без віны пакрыўдзілі; 2) паслаць трох дэпутатоў да прадседацеля, каб абдумаць, што рабіць далей, і 3) прасіць прадседацеля, каб ён востра трымаў правых ды не дапускаў, каб яны і далей рабілі скандалы ў Думе.

* * *

20-аго мая сабралася думская камісія і разгледала закон аб сьмертнай карэ.

Дэп. ад Харкоўск. губ. *Матюнін* (акцябр.) стаяў за тое, каб не касаваць закона аб сьмертнай кары, а толькі мейсцамі—дзе німа рэволюціонероў – касаваць усіленые ахраны.

Па падшчоту паліціі, як кажэ Матюнін, выпадае, што ад 1866 года да 1890 г. па прыгаворам грамданскіх судоў сказнілі 13 лю-

дзёў; ад 1890 г.—па сягоняшні дзень—ніводнаго. А па прыгаворам ваенных судоў: ад 1866 г. да 1890 г. за угалоўные справы—211 душ, а за палітычные—70; ад 1890 г. да 1900 г. за угалоўные праступкі (крымінал)—102 д., за палітычные—24. Пры канцы 1905 года па прыгаворам ваенных судоў сказнілі 10 душ, Па прыгаворам звычайных ваенных судоў сказнілі: ў 1906 г.—144 душы; ў 1907—456 д.; за гэты-ж час па прыгаворам ваенна-палевых судоў —683 душы і ў 1908 г.—825 душ.

Ад 17 акцябра 1905 г. праступкоў, за каторые бы ваенны суд меў права прыгаварыць на сьмерць, да 1 января 1906 г., было 931; ў 1906 г.—4101; ў 1907 г.—9181; ў 1908 г.—7732 праступкоў.

Дэп. *Гегечкоры і Комсін* стаялі за тое, каб скасаваць зусім закон аб караньні людзёў сьмерцяй, але за імі пайшоў толькі ешчэ адзін дэпутат, а процiў іх было 6; значыць, прызнала гэтая камісія, што закона аб кары сьмерцьцю касаваць ня трэба.

АДЗІНОКІ.

ЧАМУ так маркотна на сэрцы?
Чаму так штось грудзі гняне,
Аж гэтак здаецца і ўмерці
Не страшна было-б для мяне?

Весна за вясною праходзе,
Нямілых ня зводзе часін.
Нуда адну песьню заводзе:
Німа мне вясны—я адзін!

Эй, дзе вы, дзе, братніе душы?
Эй, дзе ты, дзяўчынка, мая?
Хто жаль мне, хто горэ заглушэ,
Рука прыгалубе чыя?

Прышліце падайце, мне слоўцэ
З далёкіх ці з блізкіх краін,
Каб я пакуль лягу ў дамоўцэ,
Быў пэўны што я не адзін.

Вільня. **А. П. Ян—кая.**

Біржы працы у Англіі.

У Англіі найбольш народу здабывае сабе хлеб працай на фабрыках, каторых тамака гэтулькі, што тавары з іх расходяцца па цэлым сьвеці. Дык работнікі займаюць бадай першае мейсцэ меж англіцкімі грамадзянамі. Аб іх справах немала клапоціцца парлямэнт (дума) і ўсё правіцельства.

Больш за тры гады працавала каралеўская камісія з 18 вучоных „экспэртоў“, каб дайсьці, якім спосабам ваеваць з недастаткам працы. Камісія прызнала, што людзі здатные і ахвочые да работы ня могуць знайсьці заробку, а тым часам фабрыкі не заўсягды маюць досі патрэбных рабочых рук. Вось, трэба завясьці такі парадак, каб кожны меў можнасць дастаць тую работу, да якой прыгодны, дык каб рабочые не збівалі адзін аднаму цэны, шукаючы працы там, дзе і без іх досі людзей працуе.

У Немецчыне, Францыі, Швэйцарыі і па іншых краёх даўно ўжо гасударства паткрывала *біржы працы*—гэтакіе канторы, каторые мусяць даставаць работу працаўніком і шукаць для фабрыкантоў патрэбных рабочых. Такіе біржы, ці канторы каралеўская камісія лічыць патрэбным завясьці і ў Англіі.

Міністэр Чэрчіль, апіраючыся на пастанаўленьня і матэр'ялы камісіі, ўжо апрацаваў праект закона *аб біржах працы і аб гасударственай страхоуцы работнікоу на прыпадак недастатку работы.* Закон гэты міністэр ўжо падаў у парлямэнт (думу).

Па закону Чэрчіля на ўсю Англію трэба аткрыць 235 кантор—„бірж працы“. Ўсе яны будуць падзелены на дзесяць часьцей—вокругоў; ў кожным вокрузе будзе адна цэнтральная кантора, куды мендые канторы павінны слаць весткі аб свабодных мейсцах і аб рабочых , што шукаюць заробку. Ізноў жэ акружные біржы аб ўсём паведамляюць міністэрства, каторае кіруе ўсей справай. На утрыманьне гэтых бірж, каторые павінны ня толькі без уселякай заплаты знайсьці работу, але, калі трэба ехаць у чужы горад, даць безработнаму грошы на праезд,—казна мусіць выдаваць што год больш за паўтара мільёна рублёў (170,000 фунтоў стэрлінгоў).

У кожным горадзі, дзе будзе біржа працы, работнікі і фабрыканты пароўну выбіраюць сваіх дэпутатоў у *кантрольную камісію*, каторая пілнуе, каб кантора акуратне спаўняла сваю павіннасць і здаволівала ўсіх, хто да яе зьвернецца аб помачы.

Можна сказаць напэўне, што гэты новы закон дасьць немала карысьці англіцкім рабочым і забеспечыць іх ад доўгай галадоўкі ў часе безрабоцьця. У парлямэнці народные дэпутаты ешчэ яго палепшаць і скора зацьвердзяць.

Даклад С. Ротванда аб эканомічным палажэньні Расеі.

У бюджэтную камісію Гасударственаго Савету С. Ротванд падаў вельмі цікавы даклад, надрукаваны ў пецербурскай газэце „*Kraj*“. Вось што ў ім знаходзім.

Перш-наперш гасударства бярэцца за такіе справы, на каторые ў народзе нехват ні грошы, ні культурных сіл.

Гэтак расходы казны на гэты год дайшлі ўжо да 2,631 мільёноў руб., (2 мільярды 631 мільён). Патрэбные грошы мусіць даць народ, але яму гэта падаецца ўсё цяжэй ды цяжэй.

Каб павялічыць даходы казны, правіцельства падало праект, што кожны, хто мае больш за тысячу рублёў у год даходу, павінен ад гэтаго даходу плаціць падатак. Палічылі, што такім парадкам можна будзе дабываць 35 ці 45 мільёноў у год,—значыць, усяго толькі *адну шэсцьдзесят шостую частку* ($1^{1}/_{2}$ працэнта) таго, што казне трэба. Гэта затым, што ў Расеі людзёў і ўселякіх інстітуцій, каторые маюць больш тысячы руб. даходу, ёсць 404 тысячы (—гэта с-памеж 140 мільёноў жыцелёў!), і яны ўсе разам зарабляюць 1.723 мільёны 800 тысяч руб. ў год,—значыць, шмат менш, як выдае адна толькі казна. Калі-б ад гэтых людзёў браць у казну нават—чверць іх даходу (—рэшта патрэбна ім на жыцьцё), дык выходзіць, што і так 2 мільярды (2.000 мільёноў) руб. трэба ўзяць з бяднейшае часьці народу—с тых, хто мае менш тысячы руб. у год.

Казна з году ў год больш трэбуе грошы на свае справы, а багацтва ў народзе не прыбывае. Напрыклад, сельская гаспадарка ў Расеі руйнуецца: цяпер 7 мільёноў работнікоў вёсковых ня можэ знайсьці сабе заробку, а тымчасам гэтые людзі кормяць ешчэ і свае семьі — $17^{1}/_{2}$ мільёноў душ. За граніцу збожа прадаюць ўсё менш, бо німа што прадаваць; скаціны цяпер у два разы менш стала, як сорак гадоў таму назад (ў 1861 г.).

Усе людзі, што жывуць у Расеі, разам маюць ў год 8 - 9 мільярдоў руб. даходу, і трэйцю часць гэтаго забірае казна Калі з агульнай лічбы адкінем тых, што маюць больш 1000 руб., то на рэшту на душу прыдзецца 60 руб. даходу ў год, ды кожнаму з іх ешчэ трэба аддаць у казну падатку 12 руб.

Гэтак,—пішэцца ў дакладзе Ротванда,—Далей быць не павінна і ня можэ: бяднейшы край, для узросту багацтва катораго казна саўсім мала робіць, ня мае ўжо сіль так жыць, як жыў дагэтуль. Трэба ўсю гасударственую гаспадарку перастроіць нанова, трэба народу даць адпачыць ад залішне вялікіх падаткоў: тады ён узмацуецца, і гасударства будзе мацнейшым.

КВЕТКА БЭЗУ.

У цёмным і душным склепе, ў сырым пакойчыку вялікаго гарадзкога дому, лежала хворая Ганулька. Абое бацькі працавалі на фабрыцэ увесь дзень і, адным адзінюсінькім ейным апекунам і дагледачом быў старэйшы на год брацітка ейны—Янка.

Стаяла пара вясенкі зялёнай, вясёлай; але той Божай вясенькі не відаць было на вуліцы, мошчэнай каменьнем, кусочэк каторай віднеўся праз шэрае ваконцэ сьцюдзёнаго і сырога пакойчыку. С падворку даходзіў да вушэй хворай Ганулькі гоман і сьмех гуляючых дзяцей, але сама яна не здалела выйсьці на падворка. Янка ад часу да часу выбегаў, але ізноў варочаўся: не забываў аб хворай. За тое вечэрам, калі, варочаліся бацькі з работы, Янка меў вольную волю, як малады жарэбчык што ў стайні застаяўся, так скакаў ён па вуліцах.

Часьцей ўсяго бегаў у тую старану горада, дзе каля дамоў багатых людзей праз паркан віднеліся сьвежые траўнікі, дзе расьлі зялёные кусты с пекнымі пахучымі кветкамі... На другі дзень Янка апаведаў хворай сястрыцы аб кветках што бачыў, аб пекных дрэвах, аб тым, што вясна цяпер і на сьвеце зялёна і ясна... Часам прінасіў засморгнутую праз паркан галінку, або травіцы жменьку; дзяўчынка лялеяла і песьціла зялёные лісточкі, цалавала іх доўга, доўга моцна прыціскаючы да засьмягшых ад гарачкі вусноў,—клала на вочы сабе халодна-звільжные лісточкі, а Янка цешыўся паспол з сястрыцай і абецываў на другі дзень, прынясьці больш і прыгажэйшых кветак—праўдзівых кветак...

Раз, як Янка даставаў праз паркан зеляніну для Ганулькі, угледзеў яго тоўсты пан і аблаяў.

— Ты-ж гэта чаго тут поўзаеш?! Гляньце ад зямлі не адрос, а ўжо красьці цікуецца.—Вон пашоў!...

Янка пашоў. Але гарчыня нейкая сачылася ў малае сэрцэйка,—слёзы набегалі ў вочы. Ішоў і думаў: благі гэны пан, дужэ благі, колькі лісточкаў зялёных жалеець, а бедная Ганулька такая хворая...

Жаль да тоўстаго пана скуматаў да сэрцэ... Янка прыстануў, брывямі крануў грозна і ўверх падняў галаву:

— Калі так, то так! Пайду і нарву сабе найпрыгожэйшых кветак,—сказаў са злосьцьцю.

Пэндам вярнуўся і стаў памаленьку цікавяцца каля паркану.

Тоўстага пана ў гародчыку ўжо ня было, затое бегалі там пекна адзетые папіеняты.

Адна дзяўчынка угледзела Янку і загаласіла развапорэным голасам:

— Гляньце, вунь абарванец неякі ўлезці сюды хочэць, гляньце!

Янка спакойна стаяў, падняўшы галаву і смела глядзеў ў вочы.

— Што табе тут трэба?—важна адазваўся паніч, шмат большы ад Янкі.

— Кветак,—адказаў коратка хлапец.

— Але, але! гэта-ж той самы злодзей, катораго папа прагнаў! —гаманіла дзяўчынка.

— Проч, проч!—крыкнулі ў вадзін голас паненяты.

Але Янка ані крануўся: стаяў са сьцягнутымі брывямі і вачэй не звадзіў з іх.

— Проч, кажу табе!—крыкнуў раззлаваны паніч, а, відзучы, што Янка не атходзіць, кінуўся з места і выламаў сук з бэзоваго куста. Скрыпнулі дзьверцы і зялёны дубец сьвіснуў над галавой Янкі.

Цяпер толькі пакінула хлапчэняці адвага,—пусьціўся наўцекі, а паніч ў дагон за ім, як гончы за зайцам.

Пабіліся б пеўне, каб ня жоўтые панічовы боцікі, на каторые шкодзіў пыл з вуліцы; глянуў ён на іх, кінуў дубец і, з мінай ваякі, вярнуўся ў гародчык.

Янка падхапіў сук і памчаў, як мага, да дому.

Тут, абарваўшы з галіны кветкі, абсыпаў імі сваю Ганульку, а бачучы, як з іх яна цешыцца, песьціць і цалуе, сам забыў ужо зневагу і цешыўся разам з ёй. Толькі час ад часу, седзючы на ейным ложэчку, Янка моўк; ўзгляд ягоны блудзіў нейгдзе далёка за сьценамі пакойчыка; сцягіваў ён брыві, а дробные ручкі, калі-некалі, зацісkаліся яму ў кулачкі...

Нядоўгая была уцеха Ганулькі!... На трэйці дзень міма гародчыка багатаго тоўстога пана няслі беленькую, маленкую дамавінку, абсыпаную ўжо правяўшымі дробнымі кветычкамі бэзу, пад каторымі лежала Ганулька...

Праз паркан гародчыка панскіе дзеці угледзілі гэту дамавінку, угледзілі і спазналі заплаканаго Янку, ўспомнілі пра кветкі...

Пасьля гэтаго колькі дзён паненяты не хадзілі ўжо гуляць ў гародчык і неяк саромяліся глянуці адно аднаму ў вочы.

Лішні.

Вучоны бык.

(Народнае апаведаньне).

Павёў Язэп бычка-трэцячка на рынак прадаваць; на дарозе спатыкае салдатоў; тые і пытаюць Язэпа:

— Куды старчэ, бычка вядеш?

— На торг прадаваць вяду, кажэ Язэп, такі нейкі неўдалы, наравісты ўдаўся,—што рады даць не магу.

— Эх, дурны ты, землячок, кажуць салдаты,—што-ж ты возьмеш за гэткую злыбіду? Атдай лепш нам яго на навуку ў горад на які год, дык прынамсі апасля жмені са тры грошы сгорнеш.

Падумаў, пачэсаўшы патыліцу, Язэп,—падумаў—згадзіўся і атдаў бычка на навуку салдатам, а сам вернуўся да дому.

Мінуў год; пайшоў Язэп у горад па свайго быка. Дапытаўся салдатоў, каторым атдаў сваю жывёлу на навуку, прыходзе да іх і пытае:

— Ну, землячкі, як мой падласы? Чы добра навучыўся?

— Ах, каб ты ведаў, кажуць яны, якой беды набраліся мы з ім! Сперша—як сперша: брыкаўся, тузаўся, бадаўся,—але неяк далі рады—угаманіўся; толькі, як прыйшло ўжо да самэй навукі, то так стаў скора браць ўсё ў свой бычачы розум, што аж рогі паадпадалі, шэрсць выпаўзла, стаў хадзіць на двух нагах,—словам зусім падабнюсенькі стаўся да чалавека, а які разумны, — аж дзіва!

— Ну, я яму скора выганю гэты розум з галавы, кажэ Язеп, толькі вядзіце мяне ў хлеў, дзе ён стаіць!

— Звар'яцеў ты, чалавечэ, чы што?—кажуць салдаты,—праўда, чэкаў ён цябе, але жыць болей з намі не захацеў: дагадзіць яму не маглі патрафіць, перэбраўся ён цяпер на сваю кватэру і чутно, папаў ў вялікіе чыноўнікі.

— Пакажыце тыкеля, просіць Язеп, дзе ён жыве, а я ўжо сам дам рады—нябось пастронкі моцные ўзяў.

Салдаты завялі Язэпа, паказалі дом куды ісьці, а самі ўцяклі. Язэп, убачыўшы на дварэ нейкаго чалавека, пытае: дзе тут жыве бык?

— Не бык, атказывае той, а Быкоў, ун ў тые дзверы ідзі. Раскруціўшы пастронак і прыгатаваўшы пугу, смела Язэп адчыняе адны, другіе дзверы, і апынуўся ў вялікім пакоі, дзе убачыў абедаўшаго за сталом пана.

— Табе чаго?—пытае той

Язэп, падміргіваючы адным вокам, зарагатаў і кажэ:

— Іш ты, падласы, які ласун! Нябось не спазнаў гаспадара?

— Вон пашоў! крыкнуў пан, выскачыўшы з за стала.

— Быську, быську,—стаў усьцішываць Язэп разгневанага пана, але той рынуўся на яго с кулакамі.

Язэп, доўга не чэкаючы, закінуў на пана пастронак, зацягнуў яго, ды давай акладаць пугай...

Немаведама чым бы гэта скончылася, каб не збегліся на крык людзі і не абаранілі пана. **Я. Ш.**



З літоўскай выстаўкі ў Вільні.

„ДОСІ ЎЖО ЯРМА!“

З жыцьця расьлін і зьвероу.

Усё на сьвеце хочэ жыць і быць свабодным. На гэтым жаданьні сходзіцца ўсё жывое,—пачынаючы ад расьлінкі, а канчаючы чалавекам. Кожны шукае такіх прылад, каб яны яго баранілі ад напасьці ворагоў. Гэтак расьліны маюць калючкі—роза, акація, крапіва, каб схавацца ад травоядных зьвероў і птушэк. Расьліны ешчэ бароняцца сваім смярдзючым пахам, праціўным смакам, сваей атрутай. —Гэта ўсё зроблена для абароны

Мы ведаем, што расьліна запускае сваі карэньчыкі ў зямлю; гэтые карэньчыкі мусяць прабівацца скрось пясок, гліну, абходзіць камні,—і да гэтаго корэнь мусіць прывыкнуць, акрэпнуць. Прыгледзьцеся да карней сасны і жыта, як яны хітра прылажэны. Але апроч тае пажывы, што ідзе з зямлі, расьліна ешчэ мусіць дабываць пажыву і вільгаць с паветрыя.—На гэта ў яе ёсць сукі і лісьці. Прыгледзьцеся, як на дрэвах растуць лісточкі, каб не прашкаджаць адзін аднаму ў дабываньню сьвету, як растуць сукі, каб вада магла па іх сцекаць.—Лісьцямі расьліны аддыхаюць; на паверхнасьці кожнаго ліста ёсць маленькіе дзірачкі, і яны могуць замыкацца і адмыкацца павэдлуг патрэбы.

На балотах растуць такіе расьліны, каторые сваімі лістамі ловяць жукоў,—напрыклад, так званая мухалоўка; калі сядзе на лісьць яе мушка якая,—то лісьць закрываецца, а тады расьлінка з'едае мягкіе часьці мушкі. Беда прымушае гэта рабіць!

Каб пладзіцца і разрастацца, расьліна мусіць мець пекные кветкі, на іх тады ахвотне седаюць розные жучкі і пчолкі, перэносяць гэтак з аднэй кветкі на другую такі пыл асобны, каторы запладняе кветку, і ў ей робіцца завязь—семя. Часам перэносіцца гэты пыл ветрам. Маленькіе кветкі маюць больш семеннога пылу, бо на іх рэдзей седаюць жучкі,—і ім запладняцца памагае вецер, перэносячы той пыл з аднэй кветкі на другую.

Зьверы маюць для абароны рогі, клыкі. Чэрэпаха мае на верху моцнае цьвёрдае пакрыцьце, ёжык—калючкі; вялікімі іголкамі акружэно цела дзікообраза;—і мы не раз відзелі, калі ёжыка злавіць, то ён скруціцца ў клубок і сваімі калючкамі як бы бароніцца. Іосць зьверы *броненосец* і *яшчур*, каторых цела пакрыта бытцам жалезнай адзежай, і гэта іх бароніць ад ворагоў.

Як даводзяць вучоные, то зьверы ад пачатку не былі так забеспечэны, але пазней муселі шукаць такіх прылад, каб добра было бараніць сваё жыцьцё. У вельмі старые часы не было гэтулькі і такіх самых гатункоў зьвероў, як цяпер; некаторые зьверы зусім згінулі,—як, напрыклад, мамонт, ці вядомы у нас тур,—другіе цяпер гінуць (зубр); паўсталі новые гатункі з новымі спосабамі жыцьця.

Серад зьвероў вялікае значэньне мае колер. Лев жыве ў пустыні і, каб вельмі не адзначацца, колёр яго шэрсьці жаўтаваты—пясочны —

Тыгрыс жыве ў лесных гушчах і прыняў колёр якбы дрэва: мае палоскі на спіне і жоўтае бруха. Гусеніца мае колёр зялёны, каб не відаць яе было ў лісьцях (хаця ёсць і іншаго колёру). Людзі дагледзілі, што жывёлачкі, пекные колёрам, найбольш бываюць ядавітые і небеспечны: іх не бароне колёр, а яд—атрута.

Серад жывых стварэньнёў ёсць і ашуканцы,—напрыклад, жучок, каторы называецца *багач*; іх надта трудна дагледзіць, бо яны так умеюць зьмяніцца, што здаецца, бытцам на зямлі ляжыць птушчыны кал, або семя пятрушкі, і птушкі іх не чэпаюць. Гусеніцы умеюць так прычапіцца да дрэва, што падобные да сучкоў. Ёсць матылькі, каторые на пагляд трудна не прыняць за упаўшы жоўты лісць дрэва (матылёк—каліма). Так сама умеюць ашуківаць павукі і жучок *багамол* (хадзячы лісьць); яго мошкі прымаюць за лісьць і проста лезуць яму ў губу. Ў моры ёсць стварэньня, каторых трудна распазнаць памеж расьлін і камней,—напр. марская зьвезда, каралі, рыба—марскі канёк і шмат другіх.

Серад расьлін і зьвероў ёсць дармаеды—кулакі, каторые жывуць чужым коштам У кожнаго дармаеда ёсць свая афяра, на рахунак каторай ён жыве. Ў навуцы дармаедоў называюць *паразітамі*. *Глісты* выцягіваюць с цела свайго карміцеля шмат пажыўных сокаў;—такіе дармаеды ёсць і у чалавека—напрыклад—салітэр. На дрэвах ёсць дармаед расьліна—омела; яна мае сваё мейсцэ на ветках дрэва і, калі яе шмат размножыцца, то дрэва засохне.—Бывае, што дармаед адзін жыве ў сярэдзіне другога. Дармаеды жывуць ўсюды, дзе можна дастаць дармовую страву. Ў кішках, нэрках, сэрцу, крыві—ўсюды заводзяцца дармаеды і гэтым сваім карміцелём робяць мучэньне і нават сьмерць.

Зьменяюцца часы, зьменяецца і сьвет. Там, дзе стаялі пушчы і цёмные бары, цяпер бачым паля і адны карчы. Зьверы—дзікая сьвіння, воўк, мядзьведзь,—ужо ня маюць мейсца і бегуць усё далей на поўнач; там ім трэба прывыкнуць да новых варункоў жыцьця, і слабейшые гінуць, а мацнейшые астаюцца; на зьмену гэтым гатункам з'яўляюцца новые. Мільёны бітв ідуць кожную мінуту на сьвеце, хаця мы ня чуем ні стрэлоў, ні стогну. Адны гінуць, другіе ўзрастаюць. Трэба на кожным кроку спадзевацца, што хтось нападзе;—змагацца зсваімі, с чужымі, трэба і з уселякімі нешчасьцямі—такое права натуры. Вось, для лепшаго змаганьня зьверы злучыліся ў грамады, каб ваяваць з ворагамі. Грамада—гэта сіла, гэта добрая школа—ў ёй можна душой і целам акрэпнуць. І дзеля таго зьверы жывуць не кожын сам адзін, а цэлай грамадой. Разам будуюць сялібу, разам працуюць, разам вяселяцца, разам смутак дзеляць. Жывучы з мусу грамадой, яны прывучаюцца шанаваць, любіць і памагаць адзін аднаму. Ў змаганьні патрэбны хаўрусы—гэта нам кажэ натура; добры прыклад даюць мураўі і пчолы. **В—д.**

З Беларусі і Літвы.

—о—

(Ад нашых карэспандэнтоу).

Вільня. Не пашэнціла тутэйшаму саюзу рускаго народу: ізноў перастала выхадзіць іхняя газэта „Марская Волна“, бо нехват грошы. Мусіць цяпер і папраўдзі гэту газэту захлібне фаля - „волна“.

= Вучоны віленскі садавод Павловіч маніцца залажыць тут школу вёсковай гаспадаркі і як лепей карыстаць з нашых гародаў. Ў казны маюць даць 2 тысячы руб. што год падмогі.

Г. **Радашковічы,** Вілен. губ. Вілейск. пав. Пагода стала цёплая, прайшоў трохі дождж, і паля паправіліся і зазелянелі. Калі і далей будзе ўсё добра, то можна спадзеваццa ураджаю.

В. **Сычэвічы** (пад Радашковічамі) хочэ разсяліцца на хутары. Нумэр 6—7 „Нашае Нівы“, дзе была разобрана справа аб хутарох, шмат памог нарадзіцца гэтай думцэ. Ў вёсковую зямлю клінам урэзаецца казённы лес. Мужыкі хочуць прасіць, каб казна ім прадала гэты клінок, тады зямлі пабольшае, а то іншые маюць толькі па 2 1/2 дзесяціны. Некаторые мудрэйшые мужыкі падбіваюць сваіх суседзёў, каб яны самі дбалі аб палепшэньні жыцця, бо чэкаць німа на што.

Некаторые людзі думаюць залажыць сельскі банчок. Рэч карыстная, і дзе толькі іх ні закладывалі, скрось яны добра ідуць, і людзі маюць карысьць. У нас толькі мала такіх цьвёрдых людзёў, што умеюць прабіць мур цемнаты, каторы акружае нашу беларускую вёску, як густы лес; хаця трэба прызнацца, што астатнімі часамі крыху адрадзілася жыцьцё па вёсках, каторые маюць ужо сьвятлейшых людзёў і драпаюцца з ямы ў гару. Каб у нас завялі новае валасное ўсесаслоўнае упраўленьне, то жыцьцё бы закіпела, а то ўсё застаялася і загнілося, як ў склепе.

Дарогі як былі 40 гадоў таму назад, дык ня толькі не сталі лепшые, але ешчэ горшые. На гэтым вялікіе страты мае кожын з нас. Зрабілі, напрыклад, як на лекарства 6 вёрст шоссэ з мястэчка на станцію Радашковічы Л. Р ж. д., а 3 вярсты каля станціі шоссэ німа, і дарога так папсавана, што бытцам вядзе да раю, бо, як кажуць, толькі дарога да пекла добрая! Здаецца, што на культурные патрэбы правінціі у нас не ідзець ні капейкі. На ст. *Алехновічы* Л. Р. ж. д. будуюць цяпер новую мураваную станцію, як-бы цэлы палац! Па нашаму мужыцкаму розуму было бы лепш гэтые 30—40 тысяч рублёў усадзіць на папраўку дарог, што вядуць да станціі. Для такога убогаго краю, як Расея, такіх палацоў ня трэба!

Гасьцінец.

М. **Маладэчна** Вілейск. пав. Вілен. губ. Недаўна нейкі Бохвак ўздумаў украсьці карову у стоража на пераездзе Ново-Нікалаеўскай ж. д. каля маёнтку Вязоўца. Стораж прыпілнаваў злодзея, схапіў стрэльбу і, як толькі Бохвак вывёў карову,—грукнуў і палажыў яго на мейсцы.

Цыпрук.

В. **Парэчье** Полочанской вол. Віленск. губ. Ашм. пав. 5 душ з нашай вёскі капалі склеп. Чацьвёра з іх пайшлі палуднаваць, а пяты астаўся ў яме. Калі тые вярнуліся да работы, то с-пад асунуўшэйся зямлі ўбачылі толь-

кі вушы таварыша, і хоць ў скорасьсі адкапалі, але той ужо ня жыў.

М. **Гарадок**, Віленск. губ. Вілейск. пав.—Нашэ мястэчка ня мела доктара; калі хто захварэе, то доктаря трэба было прывазіць здалёку. Багаты гэта мог зрабіць, а беднаму—як прыдзецца. Не памрэць—добра, а памрэ—пахаваюць.

Нашы мястэчковые людзі прыдумалі так. Яны пастанавілі, што соль мае права прадаваць толькі адзін купец, а за гэту „монополію“ ён плаціць 600 руб. у год. Гэтые 600 руб. ідуць ужо доктару. Цяпер у нас доктарам Соколов, рускі, чалавек добры і добра лечыць, хаця-ж гэтых грошы на жыцьцё яму трохі нехват.

Гарадэцкі.

М. **Капыль**, Слуцк. пав. Мін. губ. Вечаром 12 мая з Амэрыкі п ыехаў сын мешчаніна Аляксея Богдановіча, дзяцюк гадоў 25, Паўлюк. Ён прабыў ў Амэрыцэ каля пяці гадоў і, кажуць, сабраў там шмат грошы.

Да яго прыйшлі сваякі—пабачыцца і павітацца з ім. Зайшоў, гэтак сама, да яго і мешчанін Анухрэй Богдановіч, што быў разам з ім ў Амэрыцэ, распытаць пра жыцьцё свайго сына ў Амэрыцэ. Прышоўшы ў хату к Аляксею Богдановічу, Анухрэй застаў „мярыканца“, і радню яго за гарэлкаю. Анухрэй паслаў па гарэлку за свой поўрубель, а сам прысеў к сталу. За гарэлкай пачалася гутарка, ў каторай „мярыканец“ папракну ўнечым Анухрэя; той не злюбіў і пачаў выгаварываць сваю помач Паўлюку на караблі. „Мярыканец“ зазлаваў і, даўшы Анухрэю па твары, выкінуў яго с хаты...

Ліха надало пасварыўшымся ізноў спаткацца. Анухрэй, каб пасароміць „рызыканта-мярыканца“, прыгразіў на яго: „чакай-жэ, калі ты гэтакі! вось я заўтра твае каровы не пушчу на поле!“ (ў Паўлюковых бацькоў нема поля, і яны наймаюць пашу у обчэства). Тады Паўлюк с швагрусём кінуліся на Анухрэя і добра натаўклі яго. На крык Анухрэя некаторые мешчане павыбегалі с хат. Дазнаўшыся, ў чым справа, пачалі упрашываць Анухрэя, каб ён ішоў спаць. Той не захацеў і пачаў крычаць: „я пайду за імі ў карчму—хай дабіваюць!“—Яго пакінулі на вуліцы...

Назаўтрае досвіткам начлежнікі першые знайшлі недалёка ад шынка Анухрэя не жывым. Далі знаць сваім, а тые ў скорасьці адбілі тэлеграму сьледавацелю ў гор. Несвіж і данясьлі паліціі, каторая пасьпяшыла арэштаваць „госця-мярыканца“, яго бацьку і швагруся... Чы Анухрэй згарэў ад гарэлкі, чы яго прыдушыл; і Паўлюк-мярыканец з бацькам і швагрусём, невядома, бо ніякіх ні сінякоў, ні ранаў німа. Так сама нічога нэўнаго не дазнала паліція, ні доктары, каторые нябошчыка парэзалі. Пакуль што, Анухрэя пахавалі; сьледавацель абецаў шчыра ўзяцца за справу.

Як было, так было, але чалавек гэты прапаў праз гарэлку. Ўжо, здаецца, добрая навука ласуном да гарэлкі!... Ня ўжо-ж ні водзін не убаіцца і не пакіне піць?...

Цішка Гартны.

Пінск Мінск. губ. У в. Пэчанове спалілася 49 хат і грамадзкі хлебны магазын. Шкоды зрабілася на 40 тысяч руб.

Дзьвінск Вітэбск. губ. Член саюза рускаго народа Кузнецов

забіў і абабраў нейкаго Бурлана, каторы меў усяго два рублі.

= Выгарэла вялізная часьць гораду, ў якой жыве беднота. Ад нешчасьця пацярпела многа народу,—некалькі тысяч бедакоў астаюцца без усяго пад голым небам.

У **Фольварку Боркі** князя Друцкаго-Любэцкаго на запрэжэную драбіну сталі чэпляцца дзеці; адно з іх укруцілося ў кола і, хоць не пераехала дзіцяці, але разы са два акруціла і моцна пацёрла грудзі. *Той самы.*

С. **Шчыты**, Бельск. пав. Гродз. губ. 17 мая ў нас маняцца аткрыць хаўрусны банчок.

Паслалі прашеньне губэрнатару пазволіць залажыць суполыную краму.

Закупілі ўжо вялікі гмах, дзе маняцца быць: безплатная бібліотэка і чытальня імяні Павленкова, суполыная крама, склады насеньня і гаспадарскіх прыладоў.

У скорасці маем надзею, калі толькі пазволяць, зрабіць і сельско-гаспадарное таварыство.

Васіль.

Да Нёмна.

Эх, ты, Нёман, рэка!
Ці ты думаў, ці сьніў,—
Як сьлязу мужыка
Ў свае воды лавіў?
Я стаяў над табой
Сын нядолі худы,
І над цёмнай вадой
Сьпеваў песьні нуды?...
Што надызе пара—
Знемажэньне міне,
Адрадзэньня пара,
Над народам блісьне?...
Што з балячых грудзей—
Беларусі дзяцей,—
Над табой загудзе
Песьня вольных лодзей.

Цішка Гартны.

Капыль

З усіх старон.

Пецербург. Акружны суд судзіў члена рускаго народа Грыгорьева за ўбіўства работніка. Сьведкай быў правадыр саюзнікоў—Дубровін. Грыгорьев у часі суда стараўся паказаць, што шануець ён не суд, а толькі свайго камандзера—Дубровіна. Напрыклад, на пытаньня судзёў ён атказываў сідзючы, а як толькі увайшоў Дубровін, дык прад ім выцягнуўся, бытцам салдат прад генэралам.

= Ваенно-акружны суд 19 го мая аб'явіў прыгавор аб „ваенно-пісарскім саюзе", каторы вінавацілі ў тым, што ён і йшоў процію старых парадкоў у гасударстве. Прыгаварылі на 10 год у катаргу—6 чал., но 8 год—9 душ, на 6 год—8 чал. і 6 апраўдалі.

= Сэнат прызнаў, што як чалавек без хлеба, чы мяса абыйсьціся ня можэ, так сама і без дроў. Вось, цяпер гарадзкіе управы павінны будуць пілнаваць, каб гандляры дровамі не падымалі залішне высока цэн на дровы

* * *

Масква. Сэнаторская рэвізія дакапалася да спрытных штучэк маскоўскіх інтэнданцкіх чыноўні-

коў, каторые супольне з некаторымі фабрыкантамі лавілі рыбку ў мутнай вадзіцы.

Рабілі так: інтэнданцкіе чыноўнікі, ведаючы які ім патрэбны будзе зрабіць заказ, цішком наказывалі сваей хаўрусніцэ — фабрыцэ прыгатаваць заўчасу гэты тавар. А як ужо так мала часу аставалося да тэрміну дастаўкі тавара, што ніводная фабрыка не магла бы здужаць даканаць гэтаго заказу на пару, тады інтэнданцтва назначало таргі. С таргоў, ведама, можэ ўзяць падрад толькі тая фабрыка, што цішком прыгатавала ўжо тавар. Але за гэту срочную дастаўку, не баючыся, каб якая іншая фабрыка збіла цэну,—дзяруць дзьве скуры зараз: адну надзяе фабрыка, а другую інтэнданцкіе чыноўнікі...

* * *

Рыга. Гарадзкая Управа афяравала 3,400 кв. саж. зямлі на 10 год таварыству, каторае дбае а здароўі бяднейшых рабочых людзей. Гэту землю пабілі на 80 частак, пазакладалі на іх маленькіе садочкі і пусьцілі ў арэнду работнікам па рублю на год за кожны садок. У два дні ўсе садкі рабочые расхваталі і цяпер будуць мець за танные грошы дзе аддыхнуць с сваей сямейкай, дый мілую падчас занятку і такі-сякі даход.

* * *

Троіцк. Цягнуць у суд камандзера, яго памошніка, казначэя і ешчэ с пяток чыноўнікоў 12-аго Орэнбурскаго Казацкаго палка за растрату імі 243 тысяч рублёў казённых грошэй.

* * *

Саратов. У Сердобскім павеці навальніца з градам знішчыла поўтрэця тысячы дзесяцін засевоў.

———

Гор. **Бухарэст.**(Ў Румыніі). Ў Журжэве паручык Фоскалін, маючы злосьць на адваката Радулеско, напаў с пяцьмі сваімі сябрамі на яго і пачалі біць. Народ заступіўся за адваката; тады афіцэры, не пытаючыся свайго начальства, клікнулі сабе на падмогу дзьве роты салдатоў. Пакуль разбаранілі ваякоў,—Фоскаліна ўжо застрэлілі.

* * *

Мадрыд (сталіца Гіспаніі). У Каталоніі паднялося мужыцкае паўстаньне. Паўстанцы паляць двары і казённые дамы. Паслалі туды войска. Шмат раненых і забітых. „*Dzień*“.

* * *

Пэрсія. Калі сюды высылалі з Расеі генэрала Снарскаго з войскам казалі, што едзе ён бараніць пакрыўджэных і галодных людзей. І праўда: пэрсіцкі шах абецаў (ужо каторы раз!) вярнуць конституцію, падцягнуў крыху міністроў, сазваў савет, і здавалася, што пойдзе ўжо ўсё налад. Але цяпер шах прыгледзіўся добра да ратунку г. Снарскаго, як той пачаў рабіць обыскі, арыштовываць праціўнікоў шаха, накладаць кантрыбуціі, ды бомбай збурыў дом рэволюціонэроў; махнуўшы на ўсе абецанкі рукой, паехаў шах у свой загародны палац, а горад Тэгеран ізноў папаў у рукі Ляхову. „*P.*“

* * *

Амэрыка. — Ў г. Філядэльфіі трамвайные забастоўшчыкі разбілі і спалілі пяць трамвайных вагоноў. Каля 100 раб. раніла паліція.

СОНЕЙКО прыгрэло,
Растапіўся снег,
Поля зачарнела,
Ручаёк пабег.
Жучкі загудзелі,
Распусьціўся сад,
Птушачкі запелі
На вясеньні лад.
Красачкі пстракаты
Ўсюды зацьвілі,
З песьняю араты
Ўзяўся да зямлі.
Арэ, баранує
Родны свой загон,
І трудоў ня чуе,
Ані поту ён.
Сыпнула травіца,
Зелен кожны кут,
Урадзіць зямліца—
Верніцца за труд.
Як бы з-пад няволі
Вышло ўсё з зямлі;
Калі-ж лепшай долі
Даждёмся і мы?!

Стары Ўлас.

Валожын.

У рэдакцію прыслалі для прагляду:

—0—

З кнігарні „**Культура**“ Вільня, Дамініканская 14:

1) *Krótki wykład Fizyki* dla rzemieslników, monterów, maszynistów i t. d. M. Heplern. Ze 138 rys. Warszawa, 1909 r. c. 85 kop.

1) *Polityka Rosyjska w Polsce.* List otwarty do kierowników polityki rosyjskiej. Erazm Piltz. Warszawa 1909 r. C. 60 k.

Пан Э. Пільц—гэта знаёмая нам асоба—былўшы рэдактор консэрватыўнай газэты „Kraj“. Палітыка такіх органоў, як „Czas“ кракоўскі, „Słowo“ варшаўскае і „Kraj“ нікога не здаволівала, але цяпер настала рэакція і пан Э. Пільц ізноў дае свае рады. Ў кніжцы ён выказывае, што справа польская стаіць на „*martwym punkcie*“. Хто цікавы пазнаць, як хочуць вясьці адрадзэньне Польшчы правые палякі „Ugodowcy“ (прымірыцелі) павінен прачытаць гэту кнігу.

3) *Nasze pokarmy* і *napoje.* Łatwy przewodnik do badania i oceny hygjenicznej artykułów spożywczych. (z rys.) M. Dominikiewicz, b. chemik laboratorjum miejskiego w Łodzi. W 1909. c. 75 k.

4) *O postępie w religii* Józef Wasercug (odbitka z „Prawdy“. W 1909. c. 10 k.

5) *Biblioteka klasyków polskich. Dzieła zbiorowe Juliusza Słowackiego.* Wyd. prof. T. Pini.—Lwów 1909. C. 16 k.

Словацкі—гэта адзін з найвялікшых польскіх песьняроў. Аб ім было ўжо напісана ў „Н. Н.“.

Рэдактор-Выдаўца А. Ўласоў.

Друкарня М. Кухты, Дворцовая, д. № 4.